This article is distributed under the terms of the Creative Commons Attribution 3.0 PL
© Copyright by Uniwersytet Warszawski Instytut Studiów Interkulturowych Europy Środkowo-Wschodniej & individual articles to their Authors

doi: 10.32612/uw.2543618X.2025.pp.205-224

Przegląd Środkowo-Wschodni, 10, 2025
ISSN 2543-618X eISSN 2545-1324

Nr art. 20251008

Data przesłania: 09.05.2025
Data akceptacji: 17.06.2025

**Анатоль Вялікі**
Polska Akademia Nauk
akoidanov@yahoo.com
ORCID 0000-0001-7160-6366

# Заходнебеларускі грамадска-палітычны рух у адлюстраванні Камісіі па вывучэнню Заходняй Беларусі. 1926–1936 гг.

## Zachodniobiałoruski ruch społeczno-polityczny w badaniach Komisji Badań nad Zachodnią Białorusią. 1926–1936 r.

Komisja Badań nad Zachodnią Białorusią istniała w latach 1926–1936 r. Początkowo została utworzona w ramach Prezydium Instytutu Kultury Białoruskiej, a od 1929 r. – Prezydium Białoruskiej Akademii Nauk w Mińsku. Badała historię rewolucyjnego ruchu demokratycznego na tzw. Zachodniej Białorusi. Od 1931 r. wydawała biuletyn informacyjny, w którym szczególną uwagę poświęcano kształtowaniu się i rozwojowi białoruskiego ruchu narodowo-demokratycznego w Polsce, analizie działalności białoruskich legalnych partii politycznych, związków zawodowych i ruchów. Komisja i jej biuletyn odegrały ważną rolę w kształtowaniu negatywnego wizerunku ruchu narodowo-demokratycznego, jego liderów i oskarżaniu ich o „narodową demokrację" i „narodowy faszyzm", co utrwaliło się w białoruskiej historiografii radzieckiej w latach 20.–80. XX wieku.
Słowa kluczowe: Komisja Badań nad Zachodnią Białorusią, Akademia Nauk, biuletyn, „narodowa demokracja", „narodowy faszyzm", białoruski ruch społeczno-polityczny

Пасля заканчэння польска-савецкай вайны (1919–1920) і заключэння Рыжскага мірнага пагаднення (1921), Заходня Беларусь увайшла ў склад польскай дзяржавы. Знаходжанне тэрыторыі, заселенай пераважна беларусамі, якая мяжуе на стыку двух светаў – «буржуазнай Польшчы» і «сацыялістычнай Расіі», абумовілі цікавасць палітычнага і ваеннага кіраўніцтва, спецслужбаў Савецкай Беларусі да вывучэння сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і нацыянальна-культарнага становішча заходнебеларускага абшару. Зыходзячы з гэтага, Заходняя Беларусь літаральна з першых гадоў знаходжаньня ў складзе Польшчы стала аб'ектам пільнай увагі ДПУ-АДПУ-НКУС СССР і, безумоўна, БССР.

Аднак калі спецслужбы дзейнічалі нелегальна, мелі сваю рэзідэнтуру, агентаў уплыву, якія выконвалі спецыфічныя, толькі ім уласцівыя функцыі, то ў другой палове 1920-х гг. сярод палітычнага кіраўніцтва БССР паўстала задача стварэння легальнай навуковай акадэмічнай установы, галоўнай мэтай якой з'яўлялася ўсебаковае вывучэнне становішча Заходняй Беларусі, а больш глыбока і шырока − ўсёй Польшчы. 28 лютага 1927 г. (паводле іншых звестак, у канцы 1926 г.) у Менску пры Інстытуце беларускай культуры (Інбелкульце) быў створаны навукова-даследчы цэнтр − Камісія па вывучэнні Заходняй Беларусі (КЗБ). У пачатковы склад яе ўвайшлі У. Ігнатоўскі, А. Сянькевіч, І. Абрамчук і інш. Са словаў А. Цвікевіча, КЗБ мела "*бараніць інтарэсы беларускага адраджэньня на Захадзе як перад БССР, так і перад СССР. Апроч таго, у абавязку Камісіі было навуковае забеспячэньне „прапаганды нацыянальнай ідэі*"[1].

З 1929 г. Камісія дзейнічала пры Беларускай акадэміі навук у Мінску, неаднаразова змяняла назву і арганізацыйную структуру. У 1936 г. яна былаператворана ў Секцыю па вывучэнню Заходняй Беларусі пры Інстытуце гісторыі АН БССР. Адным з важней-

[1] В. Астрога, *Стварэньне і дзейнасьць камісіі па вывучэньні Заходняй Беларусі (1927–1937 гг.),*"Спадчына" 1996, nr 6, c.156.

шых накірункаў дзейнасці Камісіі, з'яўлялася выданне "Інфармацыйнага Бюлетэня Камісіі па вывучэнні Заходнй Беларусі пры БелАН". Першапачаткова аб неабходнасці выдання перыядычнага часопіса, прысвечанага вывучэнню сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага, нацыянальна-культурнага развіцця Заходняй Беларусі было заяўлена ў дакладной запісцы, накіраванай у Прадстаўніцтва ЦК КПЗБ і сакратарыят ЦК КП(б)Б ад імя Прэзідыума АН БССР, падрыхтаванай У. Ігнатоўскім і А. Ул'янавым восенню 1931 г. У бюлетэні планавалася мецць наступныя раздзелы: а) агульнапалітычны; б) эканоміка краю; в) нацыянальнае пытанне і культура; г) бібліяграфія; д) статыстыка; хроніка Заходняй Беларусі. Выданне планавалася выпускаць раз на тры месяцы, аб'ёмам 8–10 друкаваных лістоў агульным накладам 1000 асобнікаў. Першы нумар бюлетэня планавалася падрыхтаваць і выпусціць у верасні-кастрычніку 1931 г.[2] У дакладной запісцы было сфармулявана і мэтавае прызначэнне бюлетэня: У дакуменце чытаем:

> Неабходна прызнаць, што Савецкая Беларусь, увесь СССР мала ведае пра тыя палітычныя, эканамічныя і культурныя працэсы, якія адбываюцца на Заходняй Беларусі, мы мала ведаем пра фактычнае становішча Заходняй Беларусі, Мы таксама маем мала сур'ёзных матэрыялаў аб палітыцы фашыстоўскага рэжыму на Заходняй Беларусі. Рабоча-сялянскія масы, партыйны і прафсаюзны савецкі актыў, Савецкая Беларусь і ўвесь Саюз павінен лепш ведаць, што робіцца на Заходняй Беларусі ў параўнанні з тым, што ён ведае цяпер[3].

Усевалад Ігнатоўскі таксама падкрэсліваў палітычны змест бюлетэня. Дзеяч адзначаў:

> Пры пастаноўцы пытання аб выпуску часопіса мы зыходзім з наступных вырашальных меркаванняў: палітычнае значэнне такога часопіса велізарнае. Гэта часопіс будзе стала выкрываць, прыгнёт, які пануе на Заходняй Беларусі. Гэты часопіс будзе наглядным доказам

[2] Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ), ф. 242, оп.1, д. 99, л. 45–47.
[3] НАРБ, ф. 242, оп.1, д. 99, л. 48–50.

той цікавасці працоўных і сялян, савецкай інтэлігенцыі ў пытаннях Заходняй Беларусі, які яна заслугоўвае. Гэты часопіс дапаможа весці паспяховую барацьбу з фашызмам у Заходняй Беларусі, з яго пранікненнем у рабоча-сялянскія масы і ў шэрагі інтэлігенцыі. Гэты часопіс дапаможа выкрываць падрыхтоўку да вайны з боку фашызму супраць Савецкага Саюза, нарэшце, каласальнае палітычнае значэнне гэтага часопіса будзе заключацца ў тым, што ён акажа падтрымку партыі ў яе барацьбе з бела-эміgranцкімі, збольшага фашысцкімі настроямі часткі беларускай, польскай, габрэйскай інтэлігенцыі і дапаможа выкрыццю антысавецкіх настрояў і іх носьбітаў у Савецкай Беларусі[4].

Апроч палітычнага зместа, у пачатку 1930-х г. вызначылася і мэтавая аўдыторыя, для якой выдаваўся „Бюлетэнь". Галоўным чынам, выданне прызначалася не для масавага чытача, а для вызначанага кола партыйных працаўнікоў – сакратароў рай/гар/абкамаў партыі, ЦК КП(б)Б, прапагандыстаў. Улічваючы мэтавую аўдыторыю наклад „Бюлетэня" быў вельмі нязначны. Так, да 1934 г. ён выдаваўся накладам усяго 200 асобнікаў, а з 1934 г. ён склаў толькі 500[5].

Унутраная структура бюлетэня зведала нязначныя змены ў параўнанні з першапачатковым планам і да пачатку 1930-х гг. канчаткова склалася і мела 6–8 раздзелаў: 1. Эканамічнае становішча Польшчы і Заходняй Беларусі; 2. Палажэнне працоўнага класа ў Заходняй Беларусі; 3. Становішча сялянства ў заходняй Беларусі; 4. Фашысцкі тэрор; 5. З дзейнасці варожых арганізацый; 6. З Дзейнасці КПЗБ[6].

Першыя чатыры раздзелы былі абавязковымі і прысутнічалі ў кожным выпуску выдання, а астатнія ў залежнасці ад наяўнасці фактычнага матэрыялу, важнасці і актуальнасці праблемы публікаваліся выбарачна. Асаблівасцю публікуемых матэрыялаў у бюлетэні з'яўлялася іх ананімнасць. Заўважым, што матэрыялы

[4] НАРБ, ф. 242, оп. 1, д. 99, л. 48–50.

[5] Архив Национальной академии наук Беларуси (АНАНБ), ф. 68, оп. 1, д. 3, л. 12–14.

[6] НАРБ, ф. 60п, оп. 3, д. 656, л.1 об.

ў “Бюлетэні” друкавалі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі – П. Корчык, Л. Родзевіч, С. Будзінскі, М. Арэхва, П. Мятла, С. Рак-Міхайлоўскі і іншыя.

Адзначым найважнейшыя характэрныя рысы, уласцівыя „Бюлетэню”. Найперш звяртае ўвагу, што матэрыялы, якія публікавалі ў ім, мелі яскрава выражаны ідэалагічна-прапагандысцкі характар і паўтаралі партыйныя ідэалагемы ў дачыненні да Польшчы і Заходняй Беларусі, якія панавалі ў гісторыка-партыйнай літаратуры Савецкага Саюза і Беларусі ў 1920–1930-я г.

Найперш гэта тычылася характарыстыкі польскай дзяржавы, якая характарызавалася няйначай як “фашысцкая Польшча”, “фашысцкая дыктатура”, “фашысцкая дзяржава”. Такая камуна-ідэалагічная характарыстыка польскай дзяржавы не была выпадковасцю ці „ідэалагічным” абгрунтаваннем, прапанаваным беларускімі аўтарамі, якія ні тэарэтычна, ні навукова, ні ідэйна не былі ў стане вылучыць і навукова абгрунтаваць тэрмін “польскі фашызм”, “фашысцкая Польшча” з прычыны сваёй слабой тэарэтычнай падрыхтоўкі, адсутнасці вышэйшай адукацыі, ведання замежных моў і знаёмства з асноўнымі ідэйнымі і ідэалагічнымі тэорыямі, якія абгрунтоўвалі паняцце “фашызм”.

Упершыню ў СССР гэтае паняцце ўвёў, „навукова” і „ідэйна”, а таксама „ідэалагічна” абгрунтаваў Ю. Красны, у апублікаваным у „Праўдзе” (друкаваны орган ЦК РКП(б)-ВКП(б), артыкуле „Польскі фашызм”. Падводзячы вынікі сваіх разважанняў Ю. Красны рэзюмаваў:

> 1. Польскі фашызм, выступаючы ў розных пунктах Польшчы, несумненна, знаходзіцца на шляху да агульна-польскай адкрытай арганізацыі; 2. Польскі фашызм ставіць перад сабой задачы міжнароднага характару; 4. Развіццё фашысцкай арганізацыі ў Польшчы павінна з’явіцца сігналам да арганізацыі абароны для рэвалюцыйных партый і прафсаюзаў цэнтральнай Еўропы[7].

---

[7] Юз. Красный, *Польский фашизм,* «Правда», 14 декабря 1922 г., с. 2.

Звернем увагу на тое, што гэты артыкул быў апублікаваны ў "Праўдзе". Гэта азначала, што ўсе без выключэння камуністы павінны былі прымаць надрукаванае як няўхільную ісціну, якая не ставіцца пад сумненне.

У наступным, 1923 г., Ю. Красны ўжо больш грунтоўна, „навукова" і ідэалагічна развіў свае ідэі апублікаваўшы невялікую кнігу пад такой жа назвай. У ёй ён зноў паўтарыў сваю выснову аб тым, што "*У апошняй чвэрці 1922 года фашысцкія арганізацыі відавочна і шумна выступілі на арэну палітычнага жыцця ў Польшчы. Непасрэдным штуршком да гэтага несумненна з'явіўся пераварот Мусаліні ў Італіі, выступленні гэтыя прайшлі па ўсіх формах фашысцкай тактыкі*"[8].

Важнае месца ў "Бюлетэні" адводзілася асвятленню і "выкрыццю" дзейнасці беларускіх "нацыянал-демакратаў і нацыянал-фашыстаў". Галоўным ідэолагам, які сфармуляваў і тэарэтычна обгрунтаваў паняцці "нацыянал-дэмакратызм" і "нацыянал-фашызм", з'яўляецца Леапольд Радзевіч (партыйны псеўданім А. Сталевіч[9]), які ў друкаваным органе ЦК КП(б)Б "Бальшавік Беларусі" у 1929 г. надрукаваў праграмны артыкул "Аб вытоках беларускага нац.-дэмакратызму і нац.-фашызму" адзначаў:

> У апошнія часы беларускі нац.-дэмакратызм настолькі разросся, што сваёй ценню закрывае шавінізм іншых нацыянальнасцяў – ён стаў адной з галоўнейшых праяў у правай нябеспецы ва ўмовах БССР. Чаму беларускі, а не іншай нацыянальнасці нацыянал-дэмакратызм з'яўляецца небяспекай найбольш актуальнай і пагрознай у дадзены перыяд? Дзеля таго, што: 1) У сучасны момант капіталістычныя аказваюць самы рэзкі супраціў пераможнаму наступленню сацыялістычнага будаўніцтва, імпэтнаму размаху кулектывізацыі, аказваюць менавіта на вёсцы. Тут найбольш глыбокія карані капіталізму, тут найвастрэй і класавая барацьба. 2) Нацыянал-дэмакратызм, з'яўляючыся агенту-

[8] Юз. Красный, *Польский фашизм*, Москва 1923. – 41 с.

[9] А. Сталевіч, *Аб вытоках беларускага нац.-демакратызму і нац.-фашызму,* "Бальшавік Беларусі" 1929, № 10–12, с.17.

> рай польскага фашызму, каардынуе сваю контр-рэвалюцыйную работу з работай агентаў фашызму ў Заходняй Беларусі – беларускімі нацыянал-фашыстамі. Гэтай каардынацыяй беларускі нацыянал-дэмакратызм, як выяўленне ідэалогіі ў першую чаргу кулака, стварае апору ў БССР для польскага імперыялізма і садзейнічае яго падрыхтоўцы дзеля хутчэйшага нападу на СССР і 3) Беларускія нац.-дэмакраты і нацыянал-фашысты вядуць сваю антысавецкую контр-рэвалюцыйную работу галоўным чынам сярод сялянства – дробнай буржуазіі, якая найбольш падаецца хістанннням, вядуць сваю работу ў краі, асабліва на вёсцы, дзе карэннае насельніцтва пераважаючы беларускай нацыянальнасці. Вось гэтыя галоўнейшыя прычыны, якія акрэсліваюць глыбіню вытокаў нац.-дэмакратызму і якія ставяць перад партыяй і працоўнымі масамі неабходнасць накіраваць у сучасны момант галоўны агонь барацьбы супраць нац.-дэмакратызму, пераважна беларускага[10].

Далей ён пераходзіць да гістарычнага абгрунтавання прычын беларускага нац.-дэмакратызму, бо, як ён заяўляе: "*А вось аб каранях, аб вытоках беларускага нац.-дэмакратызму недастаткова асвятляецца*"[11]. На яго думку, першы перыяд звязаны, перш за ўсе з дзейнасцю Беларускай сацыялістычнай грамады (БСГ): "*Палітычна афармляецца беларускай сацыялістычнай Грамадой (БСГ). Узнікшы з дробна-буржуазнага сялянскага асяроддзя, у той час не зусім яшчэ палітычна дыферэнцыраванага, БСГ па сваей праграме і ідэалогіі была дробна буржуазнай партыяй лева-народніцкага кірунку*"[12]. Падзеі першай рускай рэвалюцыі 1905 г. прывялі да таго, што БСГ, як і іншыя палітычный партыі "*начала спаўзаць з рэвалюцыйных пазіцый, падлягаць распаду, перараджацца ў группоўку буржуазных ліберальнічаючых інтэлігентаў*"[13]. Разам з упадкам БСГ, пачаўся другі перыяд, які, на думку А. Сталевіч,

---

[10] А. Сталевіч *Аб вытоках беларускага нац.-демакратызму і нац.-фашызму*, "Бальшавік Беларусі" 1929, № 10–12, с. 17.

[11] Тамсама, с. 17.

[12] Тамсама, с. 18.

[13] Тамсама, с. 19.

звязаны з перыядам "Нашай Нівы". Для гэтага перыяду характэрна тое, што:

> Галоўнай сацыяльнай базай нашаніўскагу руху быля шляхта, кулакі, заможная частка беларускага сялянства. Сярод выдатнейшых тагачасных правадыроў беларускага буржуазнага нацыянальнага руху было ня мала абшарнікаў, як Вацлаў Іваноўскі, Ігнацы Буйніцкі, Аляксанд Уласаў і іншыя. Як бачым, нацыяналістычны рух нашаніўскага перыяду, наперакор створанай легендзе, што ён ахапляў шырокія масы, зусім нельга называць масавым, ён на працягу 10 год не стварыў ніводнага масавага выступлення і не быў удзельнікам такіх выступленняў, ён ледзьве мадзеў (так у тэксце. – А.В.) на задворкаў палітычнага жыцця[14].

Аўтар жорстка крытыкаваў "нашаніўскі перыяд" і адзначаў, што: "*Для беларускага буржуазна-нацыянальнага руху перыяду "Нашай Нівы" найбольш характэрным з'яўляецца яго барацьба супраць гегемоніі пралетарыяту, не прызнанне классавай барацьбы, беларускі шавінізм*"[15]. Характарызуючы "Нашаніўскі перыяд" ён адзначаў:

> За нашаніўскі перыяд, які займае часу ад спаду рэвалюцыі 1905 г. да Лютаўскай рэвалюцыі, буржуазна-нацыянальны рух, ідучы пад шыльдай нацыянальна-адраджэнчаскага, крысталізуе ідэалы беларускай буржуазіі, выхоўвае беларускія культурныя сілы – кадры беларускай нацыяналістычнай інтэлігенцыі, якая павінна стаць правадыром "прабуджаючагася беларускага народу[16].

Поводле Сталевіча, трэці перыяд, пачаўся пасля рэвалюцыі 1917 г., калі выявілася "контр-ревалюцыйная сутнасць" нашаніўскага палітычнага кола, якое выступіла супраць савецкай улады і стала адным з арганізатараў склікання ў лістападзе 1917 г. Усебеларускага Кангрэса. А. Сталевіч падкрэсліў:

---

[14] Тамсама, с. 19.
[15] Тамсама, с. 21.
[16] Тамсама, с. 23.

Нашаніўскія ідэолагі выходзяць на шырокую палітычную арэну, яны заклікаюць сялянскія масы на барацьбу супраць бальшавікоў, як “маскоўскай навалы”, яны арганізуюць сваю барацьбу праз скліканне так званага усебеларускага з’езда ў 1917 г., які сваімі народніцка-эсэраўскімі лозунгамі павінен паслужыць заставай для пашыраючайся пралетарскай рэвалюцыі і арганізаваць буржуазную кулацкую контр-рэвалюцыю. Усебеларускі з’езд з’яўляецца першым арганізаваным выступленнем у масах беларускай ліберальнай буржуазіі, выявіўшай цяпер адкрыта свае контр-рэвалюцыйнае аблічча, выступленнем, выкліканым патрэбай стварэння цэнтралізаванай улады усіх антыбальшавіцкіх груповак, каб пад выглядам беларускай народнай рэспублікі ратаваць капіталістычны лад[17].

На думку аўтара, чацверты перыяд звязаны з актывізацый “нац.-дэмакратызма” у БССР і “нац.-фашызма” у Заходняй Беларусі, гэта значыць у Польшчы. Паводле А. Сталевіча: “*Скансалідаванае актыўнае выступленне нац.-дэмакратызму ў Савецкай Беларусі ідзе поруч з надзвычайнай актывізацыяй і беларускага нац.-фашызму ў Заходняй Беларусі*”[18]. Адзначаючы гэты факт, аўтар падкрэсліў кіруючую ролю “польскага фашызму” у кіраўніцтве “беларускім нац.-фашызмам”: “*Нацыяналістычны лагер беларускай буржуазіі па ободвы бакі граніцы, не гледзячы на яго вонкавыя палітычныя адметнасці, з’яўляецца адзіным лагерам беларускага нац.-фашызму, які ідзе пад гегемоніяй польскай буржуазіі ў шэрагах міжнароднага антысавецкага фронту*”[19].

Не ўдаваючыся ў падрабязнасці адзначым, што палітычныя абвінавачанні ў “беларускім нац.-дэмакратызме і беларускім нац.-фашызме”, “сувязях з польскім фашызмам”, сталі асноўным абвінавачаннем супраць беларускіх грамадска-палітычных дзеячаў з Заходняй Беларусі, якія паддаліся на савецкую “прыманку”, прыехалі ў камуністычную Беларусь на прыканцы 1920-х – пачатку

[17] Тамсама, с. 24.
[18] Тамсама, с. 29.
[19] Тамсама, с. 30.

1930-х гг., дзе праз нядоўгі час былі арыштаваныя па сфальсіфікаваных справах, сасланыя ў лагеры ці растраляныя. Красамоўным сведчаннем можа служыць "праклад" лёсу Леона Бабровіча, Сымона Рак-Міхайлоўскага, Петра Мятлы, Іосіфа Гаўрыліка, Максіма Бурсевіча, Флягонта Валынца, Паўла Валошына, Ігната Дварчаніна, Сяргея Барана, Пятра Гарбацевіча (Клінцевіча), ужо ўзгаданага Леапольда Радзевіча (Сталевіча) і іншых. Калегіяй АДПУ БССР ад 9 студзеня 1934 г. і 19 мая 1934 г. яны абвінавачваліся ў стварэнні і актыўнай дзейнасці г.зв. "Беларускага нацыянальнага цэнтра (БНЦ)", а таксама ў тым, што:

> На тэрыторыі Заходняй Беларусі па заданні польскай выведкі займаліся падрыўной работай супраць рэвалюцыйных арганізацый, стваралі нацыяналістычныя арганізацыі, якія ставілі сваёй мэтай адарванне БССР ад Савецкага Саюза і стварэнне буржуазнай беларускай рэспублікі, выкарыстоўвалі гэтыя арганізацыі для засылкі на тэрыторыю СССР нацыяналістычных і шпіёнскіх кадраў у мэтах контр-рэвалюцыйнай дзейнасці, а потым самі былі закінутыя на тэрыторыю БССР, дзе стварылі з гэтых кадраў контр-рэвалюцыйную арганізацыю "Беларускі Нацыянальны Цэнтр (БНЦ), кіравалі гэтай арганізацыяй, вербавалі ў яе новых членаў, стваралі ячэйкі і дыверсійныя групы на месцах, займаліся шпіянажам на карысць польскай разведкі[20].

Паводле гэтага прысуду Л. Бабровіч быў прыгавораны да растрэлу, С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, І. Гаўрылік, І. Дварчанін, М. Бурсевіч, Ф. Валынец, П. Валошын – да растрэлу с заменай пакарання на 10 год папраўча-працоўных лагераў (ВПЛ), С. Баран – да 10 год ВПЛ, А. Радзевіч (Сталевіч), П. Гарбацевіч (Клінцевіч) – да 5 год ВПЛ. Да гэтых вязняў савецкія ўлады вярнуліся ў 1937 г., калі пастановай Тройкі Упраўлення наркамата унутранных спраў па Ленінградскай вобласці ад 9 кастрычніка 1937 г. М. Бурсевіч, П. Валошын, Ф. Валынец былі прагавораны да растрэлу. Не надоўга

[20] НАРБ, ф. 188, оп. 3, д. 272, л. 153.

іх перажылі І. Гаўрылік і І. Дварчанін, якія паводле пастановы гэтай жа Тройкі 25 лістапада 1937 г. таксама былі растраляныя[21].

Адзначым, што лідары беларускіх палітычных партый у Заходняй Беларусі не ўяўлялі маштабы палітычных рэпрэсій у Савецкай Беларусі, але ведалі, што робіць бальшавіцкі рэжым з тымі, хто выехаў з Польшчы па абмену палітвязнямі ці нелегальна перабраўся ў БССР. “Бюлецень” спрабаваў апраўдаць рэпрэсіі савецкай улады супраць дзеячаў заходне-беларускага нацыянальнага руху. На старонках выдання ў другім паўгоддзі 1934 г. пабачыў свет артыкул “Беларускія нацыянал-фашысты за работай”, аўтар якога аспрэчваў паведамленне віленскай “Беларускай Крыніцы” аб арыштах і зняволенні дзеячаў беларускага нацыянальнага руху, якія па розных прычынах пераехалі з Польшчы ў БССР. “Беларуская Крыніца” паведамляла, што:

> За апошні час бальшавікі пасадзілі ў турмы многіх беларусаў, у тым ліку і былых “Грамадоўцаў і змагароў”, як Рак-Міхайлоўскага, Дварчаніна, Мятлу, Валошына, Бурсевіча і іншых. Неабходна чымсці прыкрыць гэты жудасны факт, дык вось саветы і прыдумалі прыпісаць арыштаванным іх сумесную работу з польскай дэфензівай супраць паняволеных беларускіх сялян і рабочых. Жаданне гэтай савецкай палітыкі праз нечуванны паклёп на беларускую інтэлігенцыю там, у саветах, развязаць рукі ДПУ, выконваючых волю Масквы і знішчыць яе дашчэнту, а тут у Заходняй Беларусі ствараць у масах савецкія настроі і падрываць давер да роднай інтэлігенцыі, дэмаралізаваць яе, уцягваць больш смелых у свае нераты і штурхаць уцеклых у савецкія турмы[22].

Сутнасць і змест артыкулаў у “Бюлетэні” вызначалася ЦК КП(б) Б. на старонках выдання адзначалася, што “*Барацьба супраць беларускай буржуазіі і беларускага нацыяналізма з’яўляецца неабходнай умовай паспяховай барацьбы супраць польскай акупацыі. Рашэннем ЦК гэта задача пастаўлена перад нашай партыйя як ударная, бо*

[21] Тамсама, л. 146–147.

[22] Тамсама, ф. 60, оп. 3, спр. 656, л. 34.

*беларуская буржуазія і кулацтва моцна актывізуюцца*”[23]. Выконваючы такія ўстаноўкі ЦК КП(б)Б, у “варожыя” арганізацыі залічылі практычна ўсе легальныя беларускіх палітычныя партыі, грамадска-палітычныя арганізацыі, таварыствы і саюзы, зразумела за выключэннем кантраляваных савецкім бокам КПЗБ, ТБШ, БСРГ. У адной з публікацый адзначалася, што “*У Заходняй Беларусі першую скрыпку ў антнасавецкіх і інтэрвенцыяністскіх кампаніях стараецца іграць беларускі нацыянал-фашызм, каб выслужыцца перад польскім імперыялізмам*”[24].

Аўтары і выдаўцы “Бюлетэню” залічылі да “нацыянал-фашысцкіх” найбольш вядомыя беларускія партыі, якія дзейнічалі ў Заходняй Беларусі:

> Акрамя старых ужо добра вядомых партый беларускай буржуазіі і кулацтва (як Беларуская Санацыя” – Луцкевіча і “Белхадэцыя” – ксяндза Станкевіч) з’явіліся новыя партыі, выдаюцца новыя газеты. Вядомы правакатор па працэсу “Грамады” Фабіян Акінчыц, з блаславення ксяндза Станкевіча стварыў партыю “Беларускіх нацыянал-сацыялістаў” з газетай “Новы шлях” і адразу ўзняў шаленую прапаганду нацыяналізма і антысемітызма, пачаў траўлю БССР і дзікую барацьбу з камунізмам. З крыві і касцей “Беларускай Санацыі” паўстала “Беларуская нацыяналістычная Сябрына” з газетай “Беларусь працы”, а яе рэдактар Сарока адразу ж застракатаў аб маскоўскім імперыялізме і неабходнасці польска-беларускага збліжэння. Ажывілі сваю дзейнасці дэфензіўскія “сацыялісты”, якія пачалі выпускаць часопіс “Золак” і перш за усе ўзяліся за “знішчэнне” марксізма і за даносы на нацыянальна-вызвольны рух. Актывізаваў сваю дзейнасці і антысавецкую траўлю “Беларускі нацыянальны камітэт” у Вільні. Нягледзячы на ўзаемныя сваркі і спрэчкі, усе яны аб’ядноўваюца паміж сабой у барацьбе з рэвалюцыяй і СССР – разгорнутым фронтам ідучы у на-

---

[23] *Огонь против белоруской буржуазии и белорусского национализма*, „Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН” 1935, № 1, с. 30.

[24] „Беларуская акадэмія навук. Камісія Заходняй Беларусі. Інфармацыйны бюлетэнь” 1932, № 5–6, с. 113.

ступ супраць іх. Як і ўсялякі іншы фашызм, так і беларускі нацыянал-фашызм распаўсюджвае нацыяналізм і антысемітызм[25].

Найбольшая ўвага ў “Бюлетэню” адводзілася беларуская хрысціянскай дэмакратыі, найбольш уплывовай палітычнай плыні беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі. Аналізуючы яе праграму ў рабочым пытанні адзначалася:

> У апошнім нумары “Беларуская крыніца” (№12) надрукавала вялікі артыкул па рабочаму пытанню. Белхадэцыя, відавочна пераходзячая на шлях адкрытага фашызма да цяперашняга часу не мела ніякага ўплыву сярод працоўных. Намагаясь узмоцніць сваю ўдзельную вагу, жадая стаць асноўнай партыяй беларускай буржуазіі, Белхадэцыя вылучыла цэлы шэраг дэмагагічных мелкабуржуазных лозунгаў, пазычаных з арсенала гітлераўскай фразеалогіі да яго прышэсця да ўлады. […] Фашысцкі ўрад за апошні час робіць шаленыя спробы, каб фашызіраваць прафсаюзны рух і стварыць адзіныя фашысцкія прафсоюзы. Белхадэцыя, гаворачы аб прафсоюзах, зразумела, мае на ўвазе, фашысцкія прафсаюзы, а не класавыя. Вось так каротка выглядае праект зменаў праграмы Белхадэцыі ў пытанні рабочага руху[26].

Беларускія “нацыянал-фашысты” і “Белхадэцыя” лічыліся ворагамі Беларускай сялянска-работніцкай грамады (БСРГ). “Бюлетэнь” падкрэсліваў:

> Гэты страшэнны ўціск, пагромы і шыбеніцы фашыстскай дыктатуры, акупанты неслі і нясуць з дапамогай нацыянал-фашыстаў, гэтых здраднікаў і ворагаў Грамады. Памятаеце як Ціханоўскія і Астроўскія выкідывалі рэвалюцыйных вучняў з Віленскай і Навагрудская беларускіх гімназій і прадавалі барацьбу молодзі супраць зачынення беларускіх школ. Ніхто іншы як Астроўскі ў сакавіку 1932 г. на “чорнай каве” у клубе сполечным у Вільні на сходзе расхваляў дэкрэт

---

[25] *Огонь против белоруской буржуазии и белорусского национализма*, „Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН” 1935, № 1, с. 31.

[26] *Фашысцкая “рабочая праграма” Белхадэцыі*, „Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН” 1935, № 4, с. 113.

> аб школьніцтве, імем якога зараз зачыняюцца апошнія беларускія школы. Ніхто іншы як "Цэнтрасюз" і "Беларуская хадэцыя" гаварылі вам, што пісанне скаргаў "пану міністру" не дазволяць зачыніць Клецкую гімназію. Усе яны і "Цэнтрасаюз" і Беларуская хадэцыя і Луцкевічы і Станкевічы, Акінчыц і Ільяшэвіч вядуць траўлю на кампартыю і камсамол, на Савецкі Саюз і на БССР, дзе дзякуючы ўладзе рабочых і сялян расце культура і дабрабыт усіх працоўных[27].

Акрамя абвінавачанняў у "нацыянал-дэмакратызме" і "нацыянал-фашызме" заходне-беларускія палітычныя партыі, арганізацыі і рухі абвінавачваліся ў паланафільстве. Падкрэслівалася, што характэрнай асаблівасцю Беларускай нацыяналістычнай "Сябрыны" з'яўляецца лозунг "ідэйнага паланафільства". Сцвярджалася, што калі "Белхадэцыя" фармальна выступае супраць паланафільства, то "Беларуская нацыяналістычная Сябрына" выступае адкрыта за паланафільства, за супрацоўніцтва з "фашысцкімі арганізацыямі"[28].

Значная роля ў "Бюлетэні" надавалася дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі як "галоўнай і ключавой у нацыянальна-вызвольным руху ў Заходняй Беларусі". У раздзелах "Бюлетэня": "З дзейнасці КПЗБ", заўседы падкрэсліваўся роля і месца КПЗБ у нацыянальна-вызвольным руху. У "Бюлетэні" друкавалася інфармацыя об рознабаковай дзейнасці КПЗБ, праграмныя матэрыялы і дакументы КПЗБ. Адзначым, што Камісія рэгулярна атрымлівала па нелегальных каналах выданні КПЗБ. Напрыклад, у 1935 г. яна атрымала брашуры "Да VII Кангрэсу Камінтэрна. Зборнік рэзалюцый і матэрыялаў". Ч. 1." і "Кампартыя Польшчы (секцыя Камінтэрну). Кампартыя Заходняй Беларусі" выдадзеныя ў Вільні ў 1935 г.[29] Аб гэтым сведчыць і справаздача Камісіі па вывучэнню

---

[27] „Беларуская акадэмія навук. Камісія Заходняй Беларусі. Інформацыйны бюлетэнь" 1932, № 5–6, с. 127.

[28] *Беларуская нацыянал-фашыская партыя "Сябрына,"*Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН" 1935, № 2, с. 56.

[29] „Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН" 1935, № 4, с. 119.

Заходняй Беларусі за перашае паўгоддзе 1934 г., у якім падкрэслівалася, што "*Папоўнена бібліатэка 11 кнігамі, брашурамі і газетамі аб Заходняй Беларусі, атрыманнымі на беларускай і літоўскай мовах. Пачата камплектаванне літоўскай літаратуры, выходзячай у Заходняй Беларусі, атрыманы 1 часопіс і 5 нумароў газеты "Вільняус Жодіс*"[30].

Неабходна падкрэсліць, што Камісія ўстанавіла сувязь з шэрагам прыватных выдавецтваў у Польшчы і Літве, атрымлівала ад іх неабходную літаратуру. Красамоўна аб гэтым сведчыць справаздача Камісіі, у якой падкрэсліваецца, што:

> 1. Наладжана атрыманне літоўскіх газет як з Заходняй Беларусі так і з Літвы і іх сурьезная апрацоўка; 2. Устанаўліваецца рэгулярная сувязь з кнігарняй Шлапяліс у Вільні для атрымання адтуль неабходнай для Камісіі літаратуры. Акрамя гэтага, устанаўліваецца сувязь і з іншымі арганізацыямі Польшы для атрымання літаратуры[31].

Магчыма сцвярджаць, што Камісія не сама, а з дапамогай агентуры НКУС БССР, якая дзейнічала ў Польшчы і ў Літве, наладзіла кантакты з прыватнымі гандлёвымі крамамі і выдавецтвамі, ад якіх атрымлівала неабходную літаратуру – газеты, часопісы, кнігі, якія выдаваліся нелегальна выдавецтвам КПЗБ, а таксама і літаратуру, якая выдавалася легальна.

У 1936 г. дзейнасць Камісіі была прызнана варожай і зліквідавана. Было вырашана, што яна была створана 2-м аддзелам польскага польскага галоўнага штаба, а яе супрацоўнікі з'яўляліся "агентамі" польскай выведкі, скіраванымі па каналах КПЗБ у Беларусь і вялі разведвальную працу на карысць Польшчы"[32]. Апошні раз пра Камісію і "Бюлетэнь" узгадвалася падчас "Польскай аперацыі" НКУС у Беларусі ў 10 верасня 1937 г. у запісцы намесніка Камісіі партыйнага кантролю ВКП(б) па Беларусі Астроўскага,

---

[30] АНАНБ, ф. 68, воп. 1, спр. 3, л. 13.

[31] Тамсама, л. 11.

[32] Архіў Службы Бяспекі Украіны (СБУ), ф. 13, спр. 338, л. 84.

накіраванай сакратару ЦК КП(б)Б Аляксею Лявіцкаму аб сітуацыі ў Акадэміі навук Беларускай ССР коратка падкрэслівалася, што

> Аж да апошняга часу КЗБ атрымлівалі з-за мяжы фашысцкую літаратуру і беражна захоўвала найболей варожыя камплекты, накіраваныя супраць т. Сталіна і яго бліжэйшых паплечнікаў. Выдаваўся бюлетэнь у масавым тыражы, у якім змяшчаліся найбольш пахабныя артыкулы з фашысцкіх газет і часопісаў”[33].

У студзені 1938 г. Бюро ЦК КП(б)Б атрымала з Беларускай акадэміі навук справаздачу, у якой адзначалася:

> Акадэмія навук БССР на працягу шэрагу гадоў і да апошняга часу зьяўлялася асяродкам шпіёнска-выведнай і шкодніцкай працы ворагаў народу. Усе кіруючыя пасады ўвесь час знаходзіліся ў руках ворагаў народу − шпіёнаў Горына, Домбаля, Сурты, Шчарбакова, Панкевіча, Шпэнцэра ды іншых, якія пад выглядам навуковай працы займаліся збіраньнем шпіёнскіх зьвестак для фашысцкскіх дзяржаў [...] Асабліва вялікая шпіёнская праца праводзілася праз г. зв. Камісію па вывучэнні Заходняй Беларусі. Яны ж (г. зн. Ворагі) цалкам запоўнілі склад Камісіі, якая адзін час лічылася ў складзе аддзела ЦК КП(б)Б. Прадукцыя Камісіі павінна быць забаронена як контрарэвалюцыйная[34].

Такім чынам была пастаўлена апошняя кропка ў дзейнасці Камісіі і яе “Бюлетэня”. Дзейнасць Камісіі і яе органа неабходна разглядаць у кантэксце грамадска-палітычнага перыяду ў гісторыі Савецкай Беларусі ў 1920-х – 1930-х гг. Неабходна прызнаць, што Камісія не была і не магла быць навукова-даследчай акадэмічнай установай нягледзячы на тое, што дзейнічала ў складзе Акадэміі навук БССР. Ні па наяўнасці кадравага навуковага патэнцыялу, ні па распрацоўцы навуковай праблематыкі яна не адпавядала навуковай установе. Фактычна яе “навуковую” дзейнасць можна разглядаць як агітацыйна-прапагандысцкую, арыентаваную на вуз-

---

[33] НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 12049, л. 159; *Operacja Polska” NKWD 1937–1938 na tle represji wobec Polaków w Białoruskiej SRS. Dokumenty*, Warszawa 2022, s. 147.

[34] В. Астрога, *Стварэньне і дзейнасьць...,* с. 166.

кае кола партыйна-савецкіх работнікаў Беларусі, на прапаганду і падтрымку дзейнасці КПЗБ, на інфармаванне НКУС БССР аб унутрана- і знешнепалітычным становішчы польскай дзяржавы як патэнцыйнага вайсковага суперніка і ворага СССР.

Аналізуючы матэрыялы “Бюлетэня” адносна нацыянальна-дэмакратычнага руху і яго лідараў у Заходняй Беларусі неабходна адзначыць, што падыходы і ацэнка, фактычна сфармуляваная Л. Радзевічам і ўхваленая партыйна-савецкім кіраўніцтвам БССР на прыканцы 1920-х г. трывала замацаваліся ў беларускай савецкай гістарыяграфіі і існавалі да пачатку 1990-х г., калі адбыўся адыход ад найбольш адыёзных палітыка-ідэалагічных фармулёвак савецкага часу. Абвінавачанні ў “нацыянал-дэмакратызме” і “нацыянал-фашызме” ўсяго беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі былі цалкам сфальсіфікаванымі і навукова неабгрунтаванымі. Распушчаная і забароненая ў 1938 г. КПЗБ была ў 1956 г. палітычна рэабілітаваная. Аднак кардынальны перагляд і абвінавачанні ў “нацыянал-дэмакратызме” і “нацыянал-фашызме” заходне-беларускага нацыянальна-дэмакратычнага руху і яго лідараў, на наш погляд, адбыўся толькі часткова. Беларускія гісторыкі да цяперашняга часу не зрабілі крытычны аналіз “тэорыі”, абгрунтаванай Л. Радзевічам (Сталевічам), і не паказалі ўсю яе ненавуковасць, сфальсіфікаванасць і ідэалагізаванасць.

Разам з тым, неабходна пагадзіцца з меркаваннем беларускага даследчыка А. Савіча, што ў беларускай гістарыяграфіі гісторыі Заходняй Беларусі:

> Адбыўся відавочны зрух у накірунку да аб’ектыўнай ацэнкі беларускіх нацыянальных дзеячаў, якія сваімі намаганнямі ажыццяўлялі складаную і, часам, рызыкоўную справу актывізацыі беларускага насельніцтва ў барацьбе за ўсталяванне беларускіх палітыка-ідэалагічных, сацыяльна-эканамічных і этнакультурных прыярытэтаў[35].

[35] А.А. Савіч, *Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы*, Брэст 2012, с. 204.

## Bibliografia

Arhìŭ služby Bâspekì Ukraìny (SBU), f. 13, spr. 338, l.84. Aglâd palìtyčnyh,vaenna-fašysckìh, nacyânalìstyčnyh,katalìckìh, maladzëžnyh ì belagvardzejskìh partyj ì arganìzacyj byloj panskaj Pol′shcy [Архіў Службы Бяспекі Украіны (СБУ), ф. 13, спр. 338, л.84. Агляд палітычных, ваенна-фашысцкіх, нацыяналістычных, каталіцкіх, маладзёжных і белагвардзейскіх партый і арганізацый былой панскай Польшчы. IPN, BU, 2335/65, p.84].

Arhiv Nacional′nojakademii nauk Belarusi (ANANB), Komissiâ po izučeniû Zapadnoj Belorussii. f. 68, op. 1, d. 3, ll.12–14 [Архив Национальной академии наук Беларуси (АНАНБ), Комиссия по изучению Западной Белоруссии. ф. 68, оп. 1, д. 3, лл. 12–14].

Astroga V., *Stvarèn'ne i dzejnas'c' kamìsìì pa vyvučèn'nì Zahodnâj Belarusì (1927–1937 gg.*) „Spadčyna"1996, nr 6, s. 156 [Астрога В., *Стварэньне і дзейнасьць камісіі па вывучэньні Заходняй Беларусі (1927–1937 гг.),* „Спадчына" 1996, nr 6, с.156].

*Belaruskaâ nacyânal-fašyskaâ partyâ "Sâbryna",* „Informacionnyjbûlleten′ Komissii po izučeniû Zapadnoj Belorussii pri Belan" 1925, nr 2, s. 56 [*Беларуская нацыянал-фашыская партыя "Сябрына",* „Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН" 1925, nr 2, с.56].

*Fašysckaâ "rabočaâ pragrama" Belhadècyì, „*Informacionnyj bûlleten′ Komissii po izučeniû Zapadnoj Belorussii pri Belan" 1935, nr 4, s. 113 [*Фашысцкая "рабочая праграма" Белхадэцыі.* Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН" 1935, nr 4, с.113].

„Informacionnyjbûlleten′ Komissii po izučeniû Zapadnoj Belorussii pri Belan" 1025, nr 4, c. 119 [„Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН" 1025, nr 4, с.119].

Krasnyj, Ûz. Pol′skij fašizm, «Pravda», 14 dekabrâ1922 g., s. 2 [Красный, Юз. *Польский фашизм,* «Правда», 14 декабря 1922 г., с. 2].

Nacyânal′ny arhìŭ Rèspublìkì Belarus′ (NARB), f.242, op. 1, d. 99, ll. 45–47 [Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ), ф. 242, оп.1, д. 99, лл. 45–47].

NARB, f.188, op.3,d.272, l.153. Opredeleniâ sudebnoj kollegii po ugolovnym delam Verhovnogo Suda BSSR i oblastnyhsudov i materialy k nim. T.3. 7.08.1956–3.10.1956 gg. [НАРБ, ф. 188, оп. 3, д. 272, л. 153. Определения судебной коллегии по уголовным делам Верховного Суда БССР и областных судов и материалы к ним. Т. 3. 7.08.1956–3.10.1956 гг.].

NARB, f.4p, op.1,d.12049, l.159. Dokladnye zapiski Upolnomočennogo

komissii partijnogo kontrolâ pri CK VKP(b)po BSSR ob itogah proverki faktov narušeniâ revolûcionnoj zakonnostisudebno-sledstvennymi organami, rabote Akademii nauk BSSR, vuzov, hodestroitel′stva škol v BSSR i dr. 4 ânvarâ–9 dekabrâ 1937 g. [НАРБ, ф. 4п, оп. 1, д. 12049, л.159. Докладные записки Уполномоченного комиссии партийного контроля при ЦК ВКП(б) по БССР об итогах проверки фактов нарушения революционной законности судебно-следственными органами, работе Академии наук БССР, вузов, ходе строительства школ в БССР и др. 4 января–9 декабря 1937 г.].

NARB, f. 60p, op. 3, d. 656, l.1ob. Bûlleteni komissii Zapadnoj Belorussii pri Akademii nauk BSSR. Ânvar′–fevral′ 1934 g. [НАРБ, ф. 60п, оп. 3, д. 656, л.1об. Бюллетени комиссии Западной Белоруссии при Академии наук БССР. Январь–февраль 1934 г.].

*Ogon' protiv beloruskoj buržuazii i belorusskogonacionalizma,* „Informacionnyj bûlleten Komissii po izučeniû Zapadnoj Belorussii pri Belan" 1935, nr 1, s. 31 [*Огонь против белоруской буржуазии и белорусского национализма*, „Информационный бюллетень Комиссии по изучению Западной Белоруссии при БелАН" 1935, nr 1, с. 31].

Savìč A.A., *Nacyânal'na-vyzvalenčyruh u Zahodnâj Belarusì (1921–1939 gady): gìstaryâgrafìâ prablemy,* Brèst 2012, s. 204 [Савіч А.А., *Нацыянальна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939 гады): гістарыяграфія праблемы*, Брэст 2012, с. 204].

Stalevìč A., *Abvytokah belaruskaga nac.-demakratyzmu ì nac.-fašyzmu,* "Bal′šavìk Belarusì" 1929, nr 10–12, s. 17 [Сталевіч А., *Аб вытоках беларускага нац.-демакратызму і нац.-фашызму,* "Бальшавік Беларусі" 1929, nr 10–12, с. 17].

## West Belarusian socio-political movement in the research of the Commission for the Study of Western Belarus. 1926–1936

The Commission for the Study of Western Belarus existed in 1926–1936. It was initially created under the Presidium of the Institute of Belarusian Culture, and from 1929 under the Presidium of the Belarusian Academy of Sciences in Minsk. Researched the history of the revolutionary democratic movement in Western Belarus, the socio-economic, national and cultural development of the Western Belarusian region. Since 1931, she published an information Bulletin, in which an important place was given to the formation and development of the Belarusian national democratic movement in Western Belarus, an analysis of the activities of Belarusian legal political parties, unions

of organizations and movements. The commission and the Bulletin played an important role in the formation of a negative image of the national democratic movement, its leaders and accusations of "national democracy" and national fascism", which became established in Belarusian soviet historiography in the late 1920s–1980-s.
Keywords: Commission for the Study of Western Belarus, Academy of Sciences, Bulletin, „national democracy", „national fascism", Belarusian socio-political movement